# КАНСУЛЬТАЦЫЯ СПЕЦЫЯЛІСТА Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ РАЁННАЙ ГАЗЕЦЕ

***І. А. Івашка***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*ivashkoirina9@gmail.com*

*Навуковы кіраўнік – К. В. Лакцевіч,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

Артыкул прысвечаны экспертнаму кантэнту на старонках сучасных беларускіх раённых газет. Зроблена выснова, што з дапамогай матэрыялаў-кансультацый мясцовыя выданні павышаюць узровень аўтарытэтнасці СМІ, шукаюць новыя фарматы перадачы інфармацыі і пашыраюць аўдыторыю, а падпісчыкі бясплатна атрымліваюць каментарыі вузкапрофільных спецыялістаў.

***Ключавыя словы:*** экспертны кантэнт; кансультацыя спецыяліста; беларускія раённыя газеты; узаемадзеянне з аўдыторыяй.

# CONSULTATION OF A SPECIALIST IN THE MODERN BELARUSIAN REGIONAL NEWSPAPER

***I. A. Ivashka***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvaryjskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: I. A. Ivashka (ivashkoirina9@gmail.com)*

*Research advisor – K. V. Laktsevich,*
*candidate of Philology, associate professor*

The article is devoted to expert content on the pages of modern belarusian regional newspapers. It is concluded that with the help of consulting materials, local publications increase the level of media credibility, look for new formats for transmitting information and expand the audience, and subscribers receive comments from narrow-profile specialists for free.

***Key words:*** expert content; expert advice; belarusian regional newspapers; interaction with the audience.

Універсальнасць тэматыкі раённых выданняў і імкненне рэдакцый друкаваных СМІ замацаваць пазіцыі газет у рознаўзроставых чытачоў актуалізуе калабарацыйныя формы работы пры зборы, апрацоўцы і прэзентацыі інфармацыі. Гэта прыводзіць да прыцягнення ў вытворчы працэс кампетэнтных спецыялістаў з розных галін. Ва ўмовах перанасычанасці інфармацыя ад экспертаў становіцца запатрабаванай, паколькі журналісты і аўдыторыя ўзаемна зацікаўлены ў атрыманні якаснага і прафесійнага кантэнту, адначасова даступнага для разумення і ўспрымання без спецыяльнай падрыхтоўкі [1]. Аднак у работах даследчыкаў вывучэнне экспертных рубрык друкаваных выданняў пакуль не знайшло комплекснага аналізу, не набыло ўстойлівай тэрміналогіі. Сыходзячы з таго, што азначэнне «кансультацыя спецыяліста» найбольш абаснавалася ў навуковым полі (найперш – у працах даследчыкаў рэкламы [2]), у тэрміналогіі артыкула яно будзе разглядацца як сінонім дэфініцыі «экспертны медыякантэнт», пад якім мы, услед за Т. Л. Камінскай і А. В. Ярохінай, разумеем запатрабаваны ў аўдыторыі грамадска значны кантэнт асветніцкай скіраванасці, атрыманы журналістамі ў кампетэнтнай асобы з вузкай галіны ведаў [1].

Функцыянаванне кансультацый спецыялістаў як сродак узаемадзеяння СМІ, аўдыторыі і экспертнай садружнасці разгледзім на прыкладзе трох сучасных беларускіх мясцовых газет. Так, зэльвенская **«Праца»** звяртаецца да вопыту медыкаў і юрыстаў. У рубрыцы «Вопросы о здоровье» матэрыялы падаюцца як кансультацыі дактароў – інструктара-валеолага Ж. Пяткевіч («Профилактика нарушений зрения», «Важность здорового образа жизни для пожилых людей», № ад 02.09.2023 г.), педыятра С. Пташкінай («Жидкая зола», № ад 12.08.2023 г.), тэрапеўта М. Фядзені («Уйди, прошу, бессонница», № ад 19.08.2023 г.). На сайце матэрыялы падобнай скіраванасці знаходзяць адлюстраванне ў раздзеле «Здоровье и красота»: публікацыі закранаюць медыцынскія і псіхалагічныя аспекты аховы здароўя. У «Юрыдычнай кансультацыі» на пытанні падпісчыкаў адказвае натарыус Н. Данюк. На сайце газеты пытанні чытачоў падаюцца ў агульныя матэрыялы, афармленыя пад загалоўкам «На вопросы отвечает нотариус Гродненского нотариального округа Наталья Данюк» (запісы ад 22.07. і 04.09.2023 г.).

З такімі ж экспертамі працуе рэдакцыя **«Нарачанскай зары»** (Мядзел): каментарыі спецыялістаў размяшчаюцца ў рубрыках «Здароўе» і «Адказвае ўчастковы». У першым выпадку публікацыі будуюцца па ўзоры «апісанне сімптомаў – прычыны развіцця хваробы – алгарытм дзеянняў пры захворванні, парады па прафілактыцы» («Береги зубы смолоду», № ад 23.08.2023 г.; «Не упустить время. Инсульт – то, с чем может столкнуться каждый», № ад 23.09.2023 г.). Аўтарства публікацый пазначана імёнамі ўрачоў, якія даюць каментарый, што павялічвае сэнсавую нагрузку газетнага паведамлення, павышае давер да яго («урач-няўролаг Л. Савіліна»). У другім выпадку «кансультантамі» журналіста Н. Лісіцкай, якая пераадрасоўвае спецыялісту пытанні аўдыторыі і рыхтуе адказы да друку, выступаюць інспектары А. Кундро, Р. Іванец і А. Малько. Публікацыі рубрыкі «Адказвае ўчастковы» з’яўляюцца з перыядычнасцю ад аднаго да трох разоў на месяц. Пытанні носяць сезонны характар, паколькі датычацца правапарушэнняў, якія актуалізуюцца ў пэўную пару года («Як не стаць ахвярай пляжнага злодзея?» № ад 19.08.2023 г. – летам; «Якое пакаранне прадугледжана за захаванне незарэгістраванай паляўнічай стрэльбы?» ад 04.04.2023 г. – вясной і восенню і пад.). Другая частка кантэнту закранае здарэнні, якія не абмяжоўваюцца часам («Свой веласіпед беражы, а крадзены не купляй», № ад 02.09.2023 г.). Экспертныя матэрыялы рэгламентуюць сямейныя і суседскія адносіны («Мужу даюць віно “на павер”. Што рабіць?» ад 02.11.2023 г.), а таксама накіраваны на павышэнне сацыяльнай адказнасці жыхароў раёна («Колькі каштуе выпіць піва ля пад’езда?» ад 10.04.2023 г.).

У **«Лідскай газеце»** пытанні ад чытачоў асвятляюць прадстаўнікі чатырох прафесій. Адказы спецыялістаў прадстаўлены рубрыкамі «Житейский перекресток: вопрос психологу», «Вопрос священнику», «Вопрос участковому» і «Будзьце здаровыя». Адметна, што ў кожным выпадку падача звестак ад кампетэнтнай асобы адбываецца ў фармаце «пытанне-адказ» (публікацыі адрознівае сутворчасць спецыялістаў і журналістаў, на карысць чаго сведчаць подпісы кшталту «Подготовила Ольга Антонова» і г. д.). У першым выпадку запыты аўдыторыі асвятляе псіхолаг Т. Каральчук. Пытанні спецыялісту агучваюцца журналістам ці высылаюцца на электронную пошту рэдакцыі. Тэматычны арэал «кансультацый» ахоплівае пытанні ўзаемадзеяння з дзецьмі («Коллекционирование: еще хобби или уже болезнь?», № ад 04.10.2023 г.), міжасобаснай камунікацыі («Не надо стесняться: 7 способов побороть

застенчивость», № ад 20.09.2023 г.). Пазнаваемасці рубрыкі спрыяе не толькі ўстойлівая перыядычнасць выхаду, але і вызначанае месца ў нумары («Житейский перекресток» выходзіць на паласе «У вольны час» па серадах, чаргуючыся з падборкай «Вопрос священнику»).

У рубрыцы «Вопрос священнику» адказы дае протаіерэй Дз. Тарарака ці паводле матэрыялаў партала obitelminsk.ru інфармацыю рыхтуюць супрацоўнікі рэдакцыі. Цікавасць падпісчыкаў выклікаюць асаблівасці вядзення служб («Почему служба в церкви ведется на церковнославянском языке?», № ад 13.09.2023 г.), а таксама – агульныя пытанні хрысціянскага жыцця («Как не отвлекаться во время богослужения и грешно ли это?», № ад 27.09.2023 г.).

Камунікацыю з чытачамі рубрыкі «Вопрос участковому» вядуць інспектары міліцыі А. Атрошка, П. Ародзь, П. Стрибуть, П. Букатка і інш. Звароты падпісчыкаў закранаюць правапарушэнні адміністратыўнага і крымінальнага кодэксаў. У большасці выпадкаў пытанні звязаныя з канкрэтнымі сітуацыямі, сведкамі якіх станавіліся чытачы: «У нас в подъезде соседи купили своим сыновьям сразу два велосипеда. После прогулки мальчишки оставляют их на лестничной клетке. <…> какая ответственность предусмотрена за загромождение лестничной площадки?» («На свой страх и риск», № ад 23.09.2023 г.).

Пытанні здаровага ладу жыцця ў выданні курыруе ўрач па медыцынскай прафілактыцы раённай паліклінікі Г. Аляксейчык. Рубрыку можна назваць паўнацэннай кансультацыяй спецыяліста, паколькі, разглядаючы праблему, эксперт комплексна падыходзіць да раскрыцця тэмы: апісвае крыніцу пагрозы, папярэджвае пытанні, якія як удакладненне маглі б задаць пацыенты, расказвае аб магчымай небяспецы, дае парады па прадухіленні ўскладненняў («Почему появляются судороги в ногах и что с этим делать?», № ад 16.08.2023 г.; «Берегите слух! Врач рассказала всю правду о наушниках», № ад 23.08.2023 г.).

Акрамя таго, у практыцы раённых газет распаўсюджаны выпадкі, калі адказы кампетэнтных асоб змяшчаюцца не ў вузкаскіраваных, а агульных рубрыках «Пытанне-адказ», «Спрашивали? Отвечаем», «Вы просили рассказать», «Правда ли, что...» і інш. Думаецца, што падобны падыход дыктуецца аператыўнасцю падачы матэрыялу і невялікім аб'ёмам інфармацыі, якую нельга аб'яднаць пад рубрыкай, дзе кансультантам выступае прадстаўнік канкрэтнай прафесіі. Разам з тым афармленне «экспертнага кантэнту» у спецыяльных рубрыках аказваецца больш дзейсным у выбудоўванні камунікацыі

з аўдыторыяй, паколькі тэрмін пошуку такіх публікацый скарачаецца, а ўвага рэцыпіента не рассейваецца, што дае яму больш часу на азнаямленне з самімі матэрыяламі.

Такім чынам, размяшчэнне кансультацый спецыялістаў, з аднаго боку, выкарыстоўваецца выданнямі для павышэння аўтарытэтнасці СМІ, пошуку новых фарматаў падачы інфармацыі і прыцягнення новых чытачоў. З другога боку, з дапамогай экспертнага кантэнту падпісчыкі мясцовых газет вырашаюць пэўныя ўнутраныя запыты, знаёмяцца з алгарытмамі выхаду з крызісных сітуацый і атрымліваюць завочную кансультацыю ад спецыялістаў, доступу да якіх аўдыторыя не мае па шэрагу эканамічных і сацыяльных прычын. У сувязі з гэтым мэтазгодным бачыцца далейшае вывучэнне падыходаў у рэпрэзентацыі экспертнага кантэнту на старонках мясцовай перыёдыкі Беларусі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Каминская Т. Л.* Экспертный медиаконтент: создание и использование в современных медиа // Вопросы теории и практики журналистики. 2023. № 1. С. 24–40.
2. *Толстихина И. В.* Особенности печатной рекламы в СМИ [Электронный ресурс]. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/osobennosti-pechatnoy-reklamy-v-smi (дата обращения: 25.12.2023).